# ЭТНОКУЛЬТУРНОЕ И АРХЕОЛОГИЧЕСКОЕ НАСЛЕДИЕ БЕЛАРУСИ

## БАЎЛЕННЕ ВОЛЬНАГА ЧАСУ Ў ШЛЯХЕЦКІМ АСЯРОДДЗІ Ў КАНЦЫ XVIII – ПАЧАТКУ XIX ст.: КРЫНІЦАЗНАЎЧЫ АСПЕКТ

**В. В. Гарбачова**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, gor@bsu.by*

Штодзённае жыццё на беларуска-літоўскіх землях уяўляе сабой пэўныя мадэлі паводзінаў, сфармаваныя адпаведнымі сацыяльнымі групамі. Трэба адзначыць, што гэтыя мадэлі існавалі ў пэўнай ступені ізалявана, яны паўстаюць у адпаведнасці з панаваўшымі уяўленнямі аб адрозненнях у паходжанні людзей, разуменні іх месца ў грамадстве, рэлігійнай сітуацыі, этычнымі імператывамі і эстэтычнымі нормамі, то бок той сістэмы каштоўнасцяў, якая вызначала прызначэнне чалавека і стыль ягонага жыцця.

***Ключавыя словы:*** шляхецкае асяроддзе; вольны час; паўсядзённасць; свята.

## ВРЕМЯПРОВОЖДЕНИЕ ШЛЯХТЫ В КОНЦЕ XVIII – НАЧАЛЕ XIX в.: ИСТОЧНИКОВЕДЧЕСКИЙ АСПЕКТ

**О. В. Горбачева**

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Республика Беларусь, gor@bsu.by*

Повседневная жизнь на белорусско-литовских землях представляет собой определенные модели поведения, сформированные соответствующими социальными группами. Следует отметить, что эти модели существовали в определенной степени изолированно, они возникают в соответствии с господствовавшими представлениями о различиях в происхождении людей, понимании их места в обществе, религиозной ситуации, этическими императивами и эстетическими нормами, т. е. системой ценностей, определявшей предназначение человека и стиль его жизни.

***Ключевые слова:*** шляхта; свободное время; повседневная жизнь; праздник.

# ACTIVITIES OF THE NOBILITY IN THEIR FREE TIME AT THE END OF THE 18th – THE BEGINNING OF THE 19th CENTURIES: A SOURCE SCIENCE ASPECT

**O. V. Gorbatcheva**

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus, gor@bsu.by*

Everyday life in the Belarusian-Lithuanian lands represents certain patterns of behavior formed by the corresponding social groups. It should be noted that these patterns existed to a certain extent in isolation, they arise in accordance with the prevailing ideas about the differences in people's origins, understanding of their place in society, religious situation, ethical imperatives and aesthetic norms, i.e. the system of values that determined the purpose of a person and his style of life.

***Keywords:*** nobility; free time; everyday life; holiday.

На канец XVIII – пачатак XIX ст. можна казаць аб існаванні шляхецкай, святарскай, мяшчанскай, сялянскай і маргінальнай мадэляў, якія ўключаюць у сябе маральны кодэкс, лад жыцця і стыль паводзінаў, манеру апранацца і харчавацца, а таксама асаблівасці баўлення вольнага часу. Кожная з вызначаных сістэмаў мае свой ўнутраны падзел, які адпавядае стратыфікацыі грамадства. Як і іншыя станы, шляхта не з’яўлялася аднароднай. Пры наяўнасці такіх агульных складаючых, як «атрыманне асалоды ад паўсядзённага» [13, s. 54], зацікаўленасць да інтэлектуальнай сферы і гістарычнай спадчыны, шанаванне сямейных каштоўнасцяў, арыентацыя на «старапольскія» звычаі і генеалагічныя традыцыі, паводзіны магната, заможнага шляхціца і рэзідэнта ў вольны час ў значнай ступені адрозніваюцца.

У межах дадзенага артыкула ставіцца мэта прасачыць традыцыі баўлення вольнага часу заможнай шляхтай на падставе вывучэння наратыўных крыніц. «З чыста фармальнага пункту гледжаньня гістарычны наратыў — гэта не толькі ўзнаўленне падзей, пра якія ён апавядае, але і комплекс сімвалаў, якія кіруюць намі ў пошуках іканічнага знаку структуры гэтых падзеяў» [14, s. 90]. Храналагічныя рамкі даследавання ахопліваюць падзеі, якія адбываліся ў паўсядзённым жыцці з часоў разбораў Рэчы Паспалітай да пачатку 30-х гг. XIX ст.

У адрозненні ад палітычных, эканамічных і сацыяльна-культурных працэсаў, канцэптуальныя змены ў межах паўсядзённасці адбываюцца больш павольна, са значным спазненнем і ў дастаткова трансфармаваным выглядзе. Нягледзячы на тое, што ў азначаны перыяд змяняецца дзяржаўная прыналежнасць тэрыторый, якія шляхта якой становяцца аб’ектам даследавання, сам гэты перыяд становіцца пачаткам новай эпохі, эпохі XIX ст., акрэсленай іншай стылістычнай афарбоўкай.

У штодзённым жыцці шляхты ў даследуемы перыяд назіраецца спалучэнне свецкіх і рэлігійных традыцый, а галоўнае месца займалі святы. Для асобнага чалавека на першае месца вылучаецца святкаванне іменінаў. Свята нябеснага патрона, у гонар якога прысвойвалася імя чалавеку, было вядома ўсім. Гэта аб'ядноўвала ўсіх вернікаў, а разам з тым пакідала нейкую надзею на казачнасць, цуд, а таксама выпадковасць у з'яўленні нечаканых гасцей. Так, для Рэйтанаў галоўным сямейным святам быў дзень святой Ганны, у Рудамінаў — святой Барбары і г. д. [6, s. 152].

Само свята іменінаў магло адзначацца на працягу тыдня і болей. Дадзеная традыцыя пераходзіць з XVII ст., калі ўвогуле не існавала разумення марнай страты часу. Па дадзеных мемуарных крыніц, на іменіны ў заможнай шляхты магло збірацца ад ста да двухсот чалавек [1, с. 335]. А ў Дукштах «рэдка які дзень… здараўся без гасцей» [9, t. 17, s. 534]. Можна казаць аб дэманстрацыі гаспадарамі прынцыпаў хрысціянскай гасціннасці, атрымаўшай шырокае распаўсюджане ў XIX ст.

Распачыналіся іменіны касцёльнымі ўрачыстасцямі. Далейшая праграма складалася з традыцыйных формаў баўлення часу — застолля, танцаў і розных забаў. Цэнтральнае месца адводзілася застоллю, дзе госці прамаўлялі ў гонар імянінніка. У XVII – першай палове XVIII ст. прамова суправаджалася абрадам «абвязвання пасам», калі прамоўца абвязваў імянінніка рознымі сродкамі (поясам, хусткай, стужкай і г. д.) для дэманстрацыі сяброўскай повязі і еднасці. Паступова гэты звычай замяняецца на падарунак, які ўспрымаўся сімвалам «абвязвання».

Традыцыйным элементам сямейных застолльяў застаецца спажыванне алкаголю. У XVII–XVIII стст. у шляхецкім асяроддзі гэта разглядалася, як свайго роду абавязак, адмова ад якога магла прывесці да непрыязні і страты павагі ад суседзяў па застоллю, а нават і з боку знаёмых. Так фармавалася традыцыя, што ў застоллях пачыналася сяброўства, заключаліся саюзы, спыняліся сваркі, уладжваліся праекты на сейме, закладаліся шлюбы [3, с. 25]. Аднак на канец XVIII – пачатак XIX ст. у застольных традыцыях можна прасачыць пэўныя змены. Вядомыя па нататках Е. Кітовіча прымусы да піцця ажно да страты прытомнасці [8, s. 235–236], як праявы сармацкай культуры, паступова адыходзяць у мінулае. Гэта ж тычыцца прымянення дужых келіхаў, традыцыі іх хуткага напаўнення і бязмернага спажывання алкаголю. Паступова ў гэтай сферы замацоўваецца стрыманасць, а атракцыйнасць замяняецца разнастайнасцю прапанаваных гасцям напояў. Зразумела, што згаданыя змены адбываюцца не паўсюдна. Старыя звычаі маглі сустракацца і ў дастаткова адукаваным асяроддзі. Але ў такіх выпадках значную ролю адыгрываў менавіта склад гасцей і мэта, з якой яны збіраліся.

Трэба адзначыць, што на сямейным узроўні змены ўжо заўважныя. У тых жа Рэйтанаў пад час святаў падавалі гасцям настойку з палыні, з памаранча, жоўтую, белую цукроўку [6, s. 152], пра наяўнасць жа на святах нецвярозых нават не ўзгадваецца.

Пэўным чынам з канца XVIII ст. змяняецца і спосаб праведзення свята. Па сведчанню мемуарных крыніц, яго неад'емнымі элементамі становяцца танцы і музыка. У шляхецкіх маёнтках танцы маглі часткова замяняцца нейкімі забавамі, але музыка гучала заўсёды [7, s. 71]. Што тычыцца рэпертуара, то па сведчанню Г. Пузыны, гучалі рамансы італ'янца Ф. Паэра, М. Агінскага ці «нешта з „Гістарычных песен“ Нямцэвіча» [10, s. 18]. Тым не менш, музыка паранейшаму выконвала забаўляльную функцыю і ўспрымалася ў якасці лёгкай забавы.

Заможная шляхта імкнулася нейкім чынам вылучыцца на ўзроўні арганізацыі забаў, што з'яўлялася прыцягальным для гасцей. У Рэйтанаў у якасці забавы быў карлік Каролік. Мода на ўтрыманне карлікаў у ВКЛ з'яўляецца у першай палове XV ст. Дазволіць сабе такую раскошу маглі толькі каралеўскія сем'і і буйнейшыя магнаты [1, с. 247]. На той час карлікаў выкарыстоўвалі ў якасці блазнаў. Пад уплывам асветніцкіх ідэй дадзеная традыцыя пэўным чынам трансфармуецца. Карлікаў пачынаюць разглядаць як нейкае выключэнне, а пры наяўнасці асабовых здольнасцяў выкарыстоўваюць у якасці артыстаў. У такім выпадку выступы карлікаў можна паставіць на адзін узровень з танцамі экспрэсіўных казакоў ці балетных труп [7, s. 80].

Звычайнай забавай на хатніх святах была гульня ў карты. З XVIII ст. за гэта ўжо не пераследавалі, што назіралася ў папярэднія стагоддзі. Паступова карты распаўсюджваюцца па-за межы вялікакняскага двара, захопліваюць магнатэрыю, а затым усё шляхецкае асяроддзе, а таксама хатнюю прыслугу [5, s. 205]. Не грэбавалі гэтым заняткам і жанчыны. У выніку гульня ў карты становіцца сталай формай правядзення вольнага часу розных станаў і ўзроставых груп.

Важным элементам баўлення вольнага часу для заможнай шляхты па-ранейшаму выступае паляванне. Тым часам у XIX ст. разам з паляваннем значнае месца пачынае адводзіцца суправаджальнай атрыбутыцы. Асобым шыкам становіцца дэманстрацыя гасцям навыкаў верхавой язды, што патрабавала ўтрымання асабістых манежаў [9, t. 10, s. 315]. У магнатаў звычайна існавалі і псарні.

Яшчэ адным спосабам баўлення часу ў канцы XVIII – пачатку XIX ст. становіцца наведванне тэатру. На гэты перыяд прыватнаўласніцкі магнацкі тэатр выконваў па-большасці забаўляльную функцыю. У некаторых выпадках аматарскія тэатры проста называліся «музыкай» і складаліся з

некалькіх прыгонных музыкантаў-скрыпачоў [2, с. 36]. Тым часам тэатр з'яўляўся адным з самых прыцягальных месцаў. Напачатку XIX ст. назіраюцца змены ва ўспрыманні тэатральнай культуры. Паступова гэтае месца пераўтвараецца ў сферу інтэлектуальнага дасуга.

Шырокі распаўсюд у паўсядзённым жыцці мелі сяброўскія сустрэчы і візіты, што ўспрымалася як свайго роду барацьба з манатоннасцю. У межах такіх сустрэч замацоўваюцца новыя формы забаў, невядомыя для сармацкай культуры. Да сталай гульні ў карты і размоваў дадаецца сумеснае спажыванне кавы [7, s. 70], што ўваходзіць ва ўжытак толькі ў XVIII ст. Паступова кава становіцца элементам шляхецкай матэрыяльнай культуры не толькі падчас сустрэч. Так, у Рэйтанаў каву спажывалі штодзённа. У Рудамінаў каву пілі з раніцы, пасля імшы і пасля абеду [9, t. 17, s. 533]. А ўжо з канца XVIII ст. у дамах заможнай шляхты з'яўляюцца спецыяльныя пакоі — кавярні.

У паўсядзённым жыцці шляхты значнае месца займаў клопат аб захаванні пасагу і спадчынных рэчаў, што ў пэўнай ступені можна разглядаць як адну з формаў прыватнага калекцыянавання.

На правядзенне вольнага часу ўплывала сязоннасць. Летам ладзілі доўгія прагулкі. Існавала таксама традыцыя наведвання леса. Па сведчанню А. Пакаш, яны пару разоў на працягу лета выбіраліся з цэлым дваром ў далёкі лес. Цёплае надвор'е спрыяла наведванню вадаёмаў. Каля іх шляхта ладзіла не толькі шпацыры, а любіла таксама плаваць на лодках і батах [9, t. 17, s. 535].

Менш разнастайнасці у спосабах праведзення вольнага часу назіраецца ў вечаровы зімовы перыяд. Сталыя шляхцянкі рознага стану ў гэты час займаліся рукадзеллем. Яны шылі, вышывалі, плялі з белых тонкіх ніцяў сеткі, якія потым выкарыстоўвалі для ўпрыгожвання сваіх фрызур і аддзення, вязалі [8, s. 358]. Што тычыцца моладзі, то ў яе адносінах да згаданай сферы ў першай траціне XIX ст. пачынае назіраюцца пэўная эвалюцыя. Калі раней рукадзелле з'яўлялася адным з неабходных заняткаў жанчыны, уменнем, якім прынята было ганарыцца, то паступова гэтае месца пераходзіць да мастацкіх заняткаў — музыкі, малявання, танцаў і інш. [9, t. 10, s. 314].

Пэўную частку свайго жыцця шляхта магла праводзіць у горадзе. Лад гарадскога жыцця шляхты значна адрозніваласяся ад вясковага хранатыпу. Утрыманне сям'і ў горадзе вымагала зусім іншых сродкаў, што было складаным нават для заможных шляхціцаў. Знаходжанне ў горадзе патрабавала паказнога шыку, што, як лічылася, выступала гарантам добрага імені для дома.

Імкненне да знешней шыкоўнасці падштурхоўвала шляхціца часцей за ўсё здымаць для сям'і дом, аздоблены фарфорам, крышталём, прыгожай мэбляй, дзе былі замежныя музычныя інструменты, і які не заўсёды быў

ім па сродкам, зыходзячы з часовасці свайго знаходжання ў гарадскіх умовах. Пражыванне ў горадзе вымагала ад шляхціча ўтрымання экіпажу. У некаторых выпадках сям’я набывала для сваіх патрэб нават некалькі карэт. У дадзеным выпадку мы можам назіраць разыходжанне як з традыцыйнымі падыходамі да ўтрымання, існаваўшымі па-за межамі горада, так і звычаямі, якія замацоўваюцца з моманту распаўсюду буржуазных традыцый, звязаных з ашчаднасцю, эканоміяй і рацыянальнасцю.

У горадзе вольны час бавілі шляхам наведвання модных крамаў, шырокую папулярнасць сярод шляхцянак набываюць прагулкі па садах і скверах. Выбіраліся туды звычайна ўдзень і бралі разам з сабой дзяцей. Гарадскія сады мелі альтанкі і для наведвальнікаў гралі музыкі [9, t. 14, s. 440].

Важнае месца ў шляхецкім асяроддзі адводзілася інтэлектуальна-культурным заняткам. Адной з праяваў гэтага з’яўляецца захапленне літаратурай. Распаўсюд мела як проста любоў да літаратуры, так і творчы кампанент, прычым шырока сустракаецца чытанне менавіта на замежных мовах [11; 12]. З канца XVIII – пачатку XIX ст. у сістэму сямейнага выхавання прадстаўнікоў заможнай шляхты ўводзіцца вывучэнне мастацтваў [4]. Да ліку інтэлектуальных заняткаў можна дадаць таксама такія гульні, як шахматы і шашкі. Хаця аўтарамі нcorrectly наратыўных крыніц гэта падаецца, як звычайная форма баўлення часу [9, t. 17, s. 537].

Шырокае распаўсюджанне сярод жаночага, а ў пэўнай ступені і мужчынскага асяроддзя, мела гульня ў шарады. Сярод разнастайнасцяў сустракаецца як традыцыйны варыянт, так і рознага кшталту інсцэніроўкі. Зімовымі вечарамі займаліся адгадваннем народных касцюмаў, гістарычных сюжэтаў і г. д. [9, t. 9, s. 278], што адбывалася пад ўплывам рамантычных тэндэнцый.

Такім чынам, калі казаць аб баўленні вольнага часу шляхтай у вызначаны перыяд, то трэба адзначыць пэўныя змены ў залежнасці ад месца пражывання. У вясковым жыцці колькасць забаваў паранейшаму застаецца дастаткова абмежаванай. І тым не менш, у афарбоўцы і сутнаснай праяве забаў, якія займалі ледзь не ўвесь дзень заможнага шляхціца, назіраюцца істотныя змены. З імкнення да прыемнага баўлення часу паўстае эстэтычная зацікаўленасць да тэатральнай культуры, пачынае распаўсюджвацца новае ўспрыманне музыкі, любоў да спадчынных рэчаў пераўтварацца ў калекцыянаванні, паўстае таксама цікавасьць да літаратурнай творчасці. З пачаткам XIX ст. у паўсядзённае жыццё заможнай шляхты ўваходзяць таксама элементы дэмакратычнасці, што садзейнічае паступоваму адыходу ад пышнасці і пампезнасці да звароту ў бок прыгажосці і эстэтычнаці. Больш разнастайным становіцца жыццё шляхты пад час яе прыбывання

ў гарадскіх умовах. На змену манатоннасці і размеранасці прыходзіць дынамізм, значнае месца набываюць разнастайныя мерапрыемствы, маючыя забаўляльны характар.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Бохан Ю.*, *Скеп'ян А.* Побыт феадалаў Вялікага Княства Літоўскага ў XV–сярэдзіне XVII стагоддзя. Мінск: Беларусь, 2011.
2. *Булгарин Ф.* Воспоминания. Отрывки из виденного, слышанного и испытанного в жизни, Ч. 1. Санкт-Петербург: Издание М. Д. Ольхина, 1846.
3. *Охотский Я. Д.* Рассказы о польской старине: записки XVIII века Яна Дуклана Охотского с рукописей, после него оставшихся, переписанные и изданные И. Крашевским. Т. 1. Санкт-Петербург: тип. П. П. Меркульева, 1874.
4. *Потоцкая А.* Мемуары графини Потоцкой (1794–1820), с портретами и указателем собственных имен // Перевод с франц. А. Н. Кудрявцевой. Спб.: Изд-во Прометей Н. Н. Михайлова, [1915].
5. *Bystroń J. S.* Dzieje obyczajów w dawnej Polsce. Wiek XVI–XVIII. Wyd. Trzecie. T. II. Warszawa: Trzaska, Evert i Michalski, 1976.
6. *Horbaczowa W.* Anna Geryczowa o Rejtanach, Radziwiłłach i Iszkołdzi // Almanach Historyczny. T. 16. Kielce, 2014. S. 135–174.
7. *Kaczyński P.* Od pijatyki do fête galante. Formy zabawy na dworach magnackich w XVIII wieku // Dwory magnackie w XVIII wieku. Rola i znaczenie kulturowe / red. T. Kostkiewiczowej i A. Roćko. Warszawa: DIG, 2005.
8. *Kitowicz J.* Opis obyczajów za panowania Augusta III. Warszawa: Państwowy Instytut Wydawniczy, 1985.
9. Pakoszowa z Rudominów E. Pamiętniki (w wyjątkach) // Kronika Rodinna. 1881. T. 9. S. 275–279; T. 10. S. 310–316; T. 11. S. 345–348; T. 13. S. 410–413; T. 14. S. 439–444; T. 15. S. 471–477; T. 16. S. 499–508; T. 17. S. 532–539; T. 18. S. 569–571; T. 19. S. 598–604.
10. *Puzyna G.* W Wilnie i w dworach litewskich. Wilno: Nakładem i drukiem Józefa Zawadzkiego, 1928.
11. *Reytan S.* Marcin Kwieć: opowiadanie z czasów augustowskich z rękopismu JMC pana Wady. Warszawa, 1857.
12. *Reytan S.* Tak było u nas, powieść z rękopismu JM pana Wady. Warszawa, 1858.
13. *Rolnik D.* Portret szlachty czasów stanisławowskich, epoki kryzysu, odrodzenia i upadku Rzeczypospolitej w pamiętnikach polskich. Wydanie drugie. Katowice: Wydawnictwo UŚ, 2011.
14. *White H.* Poetyka pisarstwa historycznego / tłum. E. Domańska, M. Wiczyński, A. Marciniak. Kraków: Universitas, 2000.